ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Oksana Zabashtanskaya, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.3

Аксана Забаштанская ♦ Oksana Zabashtanskaya

незалежная даследчыца ♦Independent Researcher
ORCID: http://orcid.org/0009-0008-6310-4073
e-mail: zabashta7@gmail.com

Паўзроўневы вучэбны комплекс па беларускай мове як замежнай: праблемы падрыхтоўкі

Challenges in the Development of Multi-level Teaching Materials for Belarusian as a Foreign Language

Abstract: The article addresses the challenge of developing a comprehensive set of multi-level teaching materials for Belarusian as a foreign language. Drawing on an analysis of the current state of Belarusian glottodidactics, the sociolinguistic context of Belarusian language use, and international experience in foreign language teaching, it establishes the need for such materials and examines the main challenges involved in their development. Particular attention is paid to the "A0 level", the selection of core vocabulary, lexical variation, and the role of digital technologies. The article proposes a teaching support platform to keep the textbook responsive to evolving teaching needs.

Keywords: Belarusian as a foreign language, language teaching, multi-level textbook, CEFR, core vocabulary.

Рэзюмэ: У артыкуле разглядаецца праблема стварэння ўніверсальнага паўзроўневага вучэбнага комплексу па беларускай мове як замежнай. На аснове аналізу сучаснага стану беларускай глотадыдактыкі, сацыялінгвістычнага кантэксту функцыянавання беларускай мовы і міжнароднага досведу выкладання замежных моў абгрунтоўваецца неабходнасць стварэння такога комплексу і аналізуюцца асноўныя выклікі і праблемы, якія ўзнікаюць падчас яго падрыхтоўкі. Асобная ўвага надаецца пытанням "узроўню A0", адбору базавай лексікі, уліку лексічнай варыянтнасці і ролі лічбавых тэхналогій. Прапануецца канцэпцыя платформы метадычнага суправаджэння як умовы "жывога" функцыянавання падручніка.

Ключавыя словы: беларуская мова як замежная, глотадыдактыка, паўзроўневы падручнік, CEFR, лексічны мінімум.

1. Метадычная база беларускай глотадыдактыкі і праблема ўніверсальнага падручніка. Сучасная беларуская глотадыдактыка валодае значным метадычным патэнцыялам. У дваццаць першым стагоддзі яна склалася і як навука, і як вучэбная дысцыпліна [Калета 2019].

Выдаюцца падручнікі, навучальныя дапаможнікі, ствараюцца аўтарскія курсы, якія паспяхова выкарыстоўваюцца ў розных універсітэтах і адукацыйных цэнтрах. Аднак пераважная большасць гэтых матэрыялаў распрацоўваецца для канкрэтных нацыянальных аўдыторый і пад патрэбы пэўных навучальных устаноў, што абмяжоўвае магчымасць іх шырокага выкарыстання. У той жа час для большасці развітых моў даўно створаныя паўзроўневыя навучальныя комплексы, якія ахопліваюць узроўні валодання мовай ад A1 да C2 у адпаведнасці з Агульнаеўрапейскімі рэкамендацыямі па моўнай адукацыі (CEFR). Пра неабходнасць такога комплексу на старонках часопіса "Беларуская мова як замежная" ўжо даўно пісала Вольга Барысенка [Барысенка 2017: 22].

Адсутнасць універсальнага паўзроўневага падручніка па беларускай мове як замежнай становіцца асабліва заўважнай на фоне міжнароднай практыкі. Для большасці еўрапейскіх моў навучальныя комплексы будуюцца ў адпаведнасці з узроўнямі CEFR і могуць выкарыстоўвацца як аснова для кваліфікацыйных экзаменаў і стандартызаванай ацэнкі моўнай кампетэнцыі. Такія падручнікі не з'яўляюцца разавымі праектамі: яны пастаянна абнаўляюцца, удасканальваюцца і падтрымліваюцца шырокай прафесійнай супольнасцю. Вядомыя комплексы для англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай і польскай моў (*Headway*, *Menschen*, *Alter Ego+*, *Aula Internacional*, *Krok po kroku)* часта з'яўляюцца вынікам працы міждысцыплінарных калектываў і доўгатэрміновых праектаў, заснаваных на нарматыўных і метадычных распрацоўках нацыянальных глотадыдактычных школ. У выпадку беларускай мовы праблема ўніверсальнага падручніка мае не толькі метадычны, але і прэзентацыйны характар. Падручнік такога тыпу выконвае функцыю рэпрэзентацыі мовы ў міжнароднай адукацыйнай прасторы, задае рамкі яе апісання і ўспрымання як паўнавартаснага аб'екта вывучэння.

Распрацоўка паўзроўневага падручніка патрабуе наяўнасці шэрагу метадычных і нарматыўных асноваў: апісання ўзроўняў валодання мовай, лексічнага мінімуму, а таксама стандартаў, з якімі маглі б суадносіцца навучальныя матэрыялы. На сённяшні дзень мы маем выдадзеныя паўзроўневыя лексічныя мінімумы [Сямешка і інш. 2016; Сямешка і інш. 2017], распрацоўкі фразеалагічнага мінімуму [Каліта, Садоўская, Старавойтава 2021]. Лексічныя мінімумы для ўзроўняў B1–B2 распрацоўвае Іна Каліта. Акрамя таго, выйшлі ўзроўні валодання беларускай мовай як замежнай [Сямешка і інш. 2025]. Апошняе выданне можна сёння разглядаць як замену дзяржаўных стандартаў беларускай мовы як замежнай: для стандартаў у тым выглядзе, якія існуюць у суседніх краінах, на жаль, няма найперш прававога падмурка, бо моўная палітыка ў незалежнай Беларусі рэалізавалася непаслядоўна.

2. Спецыфіка сацыялінгвістычнага кантэксту. Паводле класіфікацыі ЮНЕСКА, беларуская мова адносіцца да моў, якія знаходзяцца пад пагрозай, што істотна адрознівае яе сітуацыю ад большасці моў, для якіх традыцыйна ствараюцца паўзроўневыя навучальныя комплексы. Беларускую мову як замежную часта вывучаюць студэнты і даследчыкі, чыя спецыялізацыя звязаная са славістыкай і беларусістыкай, а таксама навучэнцы, матываваныя культурнымі, інтэлектуальнымі, прафесійнымі або ідэнтычнаснымі фактарамі [Сямешка 2018]. Неспрыяльным фактарам з'яўляецца разарванасць моўнай супольнасці: у сучасных умовах камунікатыўная функцыя беларускай мовы ў большай ступені рэалізуецца па-за межамі Беларусі — у дыяспары і ў інтэрнэт-асяроддзі.

На фоне абмежаванага выкарыстання беларускай мовы ў паўсядзённай камунікацыі істотнай сферай яе функцыянавання становіцца інтэрнэт-асяроддзе, дзе беларуская мова выкарыстоўваецца ў розных формах анлайн-камунікацыі [Важнік 2006: 79–89; Waszczyńska 2018: 171–185]. Аднак для навучэнцаў гэтае асяроддзе не можа выконваць ролю класічнага моўнага "пагружэння", характэрнага для вывучэння моў з устойлівай дзяржаўнай і сацыяльнай падтрымкай. У выніку працэс навучання беларускай

мове як замежнай адбываецца ва ўмовах абмежаванага або апасродкаванага кантакту з жывым маўленнем.

Асобна трэба адзначыць спарадычны характар выкладання беларускай мовы як замежнай. Выкладчыкі і навучэнцы раскіданы па розных краінах і інстытуцыях: існуюць асобныя ўніверсітэцкія цэнтры (у Польшчы, Славакіі, Кітаі і інш.), прыватныя моўныя курсы, а таксама настаўнікі-аматары, якія працуюць па-за акадэмічнымі рамкамі. Такая сітуацыя ўскладняе абмен досведам, сістэмную экспертызу навучальных матэрыялаў і іх метадычнае ўдасканаленне.

Усё гэта патрабуе асаблівага падыходу да стварэння паўзроўневага падручніка па беларускай мове як замежнай — падыходу, які ўлічвае адсутнасць стабільнага камунікатыўнага асяроддзя, матывацыйную спецыфіку навучэнцаў і дыяспаральны характар сучаснага функцыянавання мовы.

3. Падручнік і платформа: канцэпцыя суправаджэння і калектыўнай працы. Паўзроўневы падручнік па беларускай мове як замежнай разглядаецца ў дадзенай працы як базавы навучальны прадукт, аналагічны вядомым серыям у іншых краінах. Ён павінен існаваць у традыцыйным папяровым фармаце і быць самадастатковым з пункту гледжання зместу і структуры. Аднак з улікам спецыфікі беларускай мовы і сучасных умоў навучання такі падручнік не можа эфектыўна функцыянаваць без дадатковай інфраструктуры. Менавіта ў гэтым кантэксце прапануецца канцэпцыя платформы, якая не замяняе падручніка, але забяспечвае яго метадычнае, камунікатыўнае суправаджэнне і экспертызу. Асноўнай задачай такой платформы з'яўляецца аб'яднанне ўсіх зацікаўленых бакоў: акадэмічнай супольнасці, прафесійных выкладчыкаў, настаўнікаў-аматараў, студэнтаў, а таксама прадстаўнікоў сумежных сфер (дызайнераў, выдаўцоў, ініцыятыўных праектаў).

Платформа павінна выконваць некалькі ключавых функцый. Па-першае, яна забяспечвае доступ да дадатковых матэрыялаў, у першую чаргу аўдыяфайлаў і, пры неабходнасці, відэаматэрыялаў, якія немагчыма ў поўным аб'ёме рэалізаваць у папяровым фармаце. Гэта асабліва важна для беларускай мовы, дзе праблемы вымаўлення і інтанацыі не могуць быць кампенсаваныя натуральным маўленчым асяроддзем. Па-другое, платформа служыць прасторай для метадычнай падтрымкі выкладчыкаў, у тым ліку тых, хто не мае спецыяльнай глотадыдактычнай падрыхтоўкі. Метадычныя рэкамендацыі, каментарыі да ўрокаў, варыянты працы з матэрыялам дазваляюць улічваць спецыфіку навучання беларускай мове як замежнай і зніжаюць бар'ер уваходу для настаўнікаў-аматараў. Па-трэцяе, платформа стварае ўмовы для апрабацыі і пастаяннага ўдасканалення падручніка. У адрозненне ад традыцыйнай мадэлі, калі праца над навучальным дапаможнікам фактычна завяршаецца ў момант яго публікацыі, прапанаваная канцэпцыя прадугледжвае "жывое" існаванне праекта — з магчымасцю зваротнай сувязі, абмеркавання, удакладнення і карэкціроўкі матэрыялаў.

Такім чынам, платформа разглядаецца не як абавязковы інтэрактыўны курс або электронны падручнік, а як адкрытая прастора супольнай працы, якая падтрымлівае і развівае базавы навучальны прадукт. У сучасных умовах такая мадэль уяўляецца асабліва актуальнай для беларускай мовы як замежнай, якая патрабуе не толькі падручніка, але і ўстойлівай прафесійнай і грамадскай падтрымкі.

Варта адзначыць, што ў міжнароднай практыцы выкладання замежных моў шырока распаўсюджаны комплексныя навучальныя курсы, распрацаваныя прыватнымі аўтарскімі калектывамі. Такія курсы, нягледзячы на адсутнасць статусу дзяржаўных праграм, арыентуюцца на агульнапрынятыя еўрапейскія стандарты моўнай кампетэнцыі (CEFR) і нават могуць выконваць функцыю дэ-факта метадычнага эталона. Паказальны прыклад – серыя навучальных матэрыялаў *Headway* (аўтары — Liz Soars, John Soars), якая выкарыстоўваецца ў выкладанні англійс-

кай мовы як замежнай у розных краінах і структуруецца ў адпаведнасці з узроўнямі CEFR (A1–C1). Важны фактар тут – акадэмічная падтрымка і інстытуцыйная экспертыза. Так, серыя навучальных комплексаў *Headway* выпускаецца выдавецтвам Oxford University Press, якое з'яўляецца структурным падраздзяленнем University of Oxford. Гэта забяспечвае курсу сувязь з універсітэцкай акадэмічнай традыцыяй, шматузроўневае рэцэнзаванне і адпаведнасць сучасным даследаванням у галіне лінгвістыкі і методыкі выкладання замежных моў. Хоць сам курс не мае статусу дзяржаўнай праграмы, яго распрацоўка і распаўсюджанне адбываюцца ў кантэксце ўніверсітэцкай адукацыйнай культуры, што надае яму высокую ступень даверу і спрыяе шырокаму прызнанню ў міжнароднай практыцы. Найважнейшы кампанент курса – электронная платформа *Headway*. Яна ўяўляе сабой не проста дадатак да друкаванага падручніка, а комплекснае асяроддзе метадычнага і навучальнага суправаджэння. Яна ўключае аўдыя- і відэаматэрыялы, інтэрактыўныя практыкаванні, дадатковыя тэксты, а таксама інструменты для працы выкладчыка (метадычныя рэкамендацыі, тэсты, матэрыялы для дыферэнцыяцыі навучання). Прынцыпова важным з'яўляецца тое, што платформа пастаянна абнаўляецца і функцыянуе як "жывы" працяг курса, забяспечваючы яго адаптацыю да зменаў у навучальных умовах і патрэб навучэнцаў.

4. Лічбавыя тэхналогіі і змена ўмоў вывучэння мовы. Сучасныя ўмовы вывучэння замежных моў істотна змяніліся ў сувязі з шырокім выкарыстаннем лічбавых тэхналогій. Навучэнцы больш не абмежаваныя папяровымі слоўнікамі і традыцыйнымі дапаможнікамі: у працэсе навучання актыўна выкарыстоўваюцца электронныя перакладчыцкія сэрвісы, сістэмы аўтаматычнага распазнавання маўлення, а таксама інструменты штучнага інтэлекту. Гэты фактар яшчэ адносна нядаўна не ўлічваўся ў глотадыдактыцы, аднак сёння ён непасрэдна ўплывае на спосабы засваення мовы.

Беларуская мова ў гэтым плане знаходзіцца ў вельмі спрыяльнай сітуацыі. Яна прадстаўленая ў буйных электронных корпусных рэсурсах, у першую чаргу ў Беларускім N-корпусе; разам з тым працягваецца распрацоўка новых корпусных праектаў. Беларуская мова таксама падтрымліваецца сучаснымі сістэмамі машыннага перакладу, у тым ліку DeepL і Google Translate, і рэпрэзентаваная ў значным масіве індэксаваных электронных моўных рэсурсаў — слоўніках, даведніках і іншых лексікаграфічных і тэкставых базах. Гэта дазваляе навучэнцам аператыўна атрымліваць тлумачэнні, пераклады і кантэкстуальныя прыклады, што зніжае залежнасць ад традыцыйных крыніц і змяняе ролю падручніка ў навучальным працэсе.

У сувязі з гэтым традыцыйнае ўяўленне пра тое, што недастатковае разуменне лексічнай адзінкі або граматычнай канструкцыі на ўроку прыводзіць да незваротнага "прабелу" ў ведах навучэнца, патрабуе перагляду. Сучасныя тэхнічныя сродкі дазваляюць кампенсаваць такія прабелы праз самастойную працу і пошук інфармацыі па-за межамі заняткаў. Адпаведна, метадычныя падыходы павінны ў большай ступені арыентавацца на стымуляванне самастойнай дзейнасці навучэнцаў і развіццё іх здольнасці працаваць з моўнымі рэсурсамі.

Для беларускай мовы як замежнай гэты аспект мае асаблівае значэнне. Ва ўмовах адсутнасці натуральнага камунікатыўнага асяроддзя лічбавыя тэхналогіі часткова бяруць на сябе функцыю медыятара паміж навучэнцам і мовай. Гэта не адмяняе ролі выкладчыка і падручніка, але змяняе акцэнты: навучанне ўсё ў большай ступені становіцца працэсам сумеснай навігацыі па моўнай прасторы, а не выключна перадачай гатовых ведаў.

5. "Узровень A0" і ўводна-фанетычны курс як метадычная праблема. Адной з першых метадычных праблем пры распрацоўцы паўзроўневага падручніка па беларускай мове як замежнай з'яўляецца пытанне так званага "ўзроўню A0"

і ўводна-фанетычнага курса. У большасці вядомых міжнародных навучальных комплексаў (напрыклад, *Headway*) спецыяльны ўводны ўзровень адсутнічае: навучанне пачынаецца адразу з камунікатыўных сітуацый, а авалоданне графікай і фанетыкай адбываецца ў працэсе працы з асноўным матэрыялам. Такая мадэль апраўданая ў выпадку моў, якія выкарыстоўваюць лацініцу і маюць устойлівае камунікатыўнае асяроддзе.

Для беларускай мовы як замежнай дадзены падыход не можа быць механічна перанесены. Пэўная частка навучэнцаў не валодае кірыліцай, а доступ да жывога маўленчага асяроддзя ў большасці выпадкаў абмежаваны або цалкам адсутнічае. У выніку вымаўленне, інтанацыя і фанетычныя асаблівасці беларускай мовы не могуць быць засвоены натуральным шляхам і патрабуюць мэтанакіраванай метадычнай працы. У той жа час патрэба ў працяглым уводна-фанетычным курсе залежыць ад папярэдняга моўнага досведу навучэнцаў. Для тых, хто ўжо валодае рускай або ўкраінскай мовай і знаёмы з кірылічнай графікай, такі этап можа быць істотна скарочаны.

У гэтым кантэксце прапануецца ўвядзенне кароткага ўводнага курса для студэнтаў, якія знаходзяцца на так званым "ўзроўні А0". Гэты курс выконвае не лексічна-граматычную, а перадусім фанетычную і адаптацыйную функцыі. Мэтай такога ўводнага курса з'яўляецца не фарміраванне актыўнага слоўнікавага запасу, а авалоданне кірыліцай, базавымі навыкамі чытання і, што асабліва важна, прыстасаванне маўленчага апарату да спецыфікі беларускага вымаўлення. Ва ўводным курсе ўвага можа надавацца асваенню графікі і правілаў чытання, трэніроўцы вымаўлення і адрознення асобных гукаў і гукавых спалучэнняў, якія выклікаюць цяжкасці ў іншамоўных навучэнцаў, фарміраванню базавых інтанацыйных мадэляў. Лексічны матэрыял на дадзеным этапе адыгрывае дапаможную ролю і не з'яўляецца самамэтай.

Такім чынам, уводны курс у межах падручніка разглядаецца не як абавязковы элемент для ўсіх навучэнцаў, а як метадычны інструмент, які можа выкарыстоўвацца ў залежнасці ад моўнага досведу і патрэбаў аўдыторыі.

6. Лексічны мінімум і праблема варыянтнасці ў базавай лексіцы. Асобнай метадычнай праблемай пры распрацоўцы паўзроўневага падручніка па беларускай мове як замежнай з'яўляецца пытанне рэпрэзентацыі лексічнага мінімуму, у першую чаргу на пачатковых узроўнях навучання. Традыцыйны падыход у глотадыдактыцы прадугледжвае адбор базавай лексікі на аснове нарматыўных слоўнікаў, што забяспечвае яе даступнасць для навучэнцаў і магчымасць самастойнай праверкі значэнняў.

Аднак у выпадку беларускай мовы такая мадэль сутыкаецца з праблемай высокай варыянтнасці, якая закранае нават базавы лексічны ўзровень. У сучасным маўленні, у тым ліку ў інтэрнэт-дыскурсе і публіцыстычных тэкстах, паралельна функцыянуюць лексічныя адзінкі, якія аднолькава адносяцца да нейтральнага рэгістра, але па-рознаму прадстаўлены ў слоўніках і ў жывой камунікацыі (напрыклад, *кашалёк — гаманец*, *ручка — асадка*, *папка — тэчка* і г.д.).

З метадычнага пункту гледжання сістэмнае ўвядзенне сінаніміі на пачатковым этапе навучання лічыцца непажаданым, паколькі яно можа ўскладняць засваенне мовы. Аднак у дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра стылістычныя сінонімы, а пра лексічныя дублеты, якія ўзніклі гістарычна і функцыянуюць у сучаснай камунікацыі як раўнапраўныя адзінкі. Ігнараванне гэтай з'явы прыводзіць да разрыву паміж навучальным матэрыялам і рэальным моўным ужываннем.

У сувязі з гэтым прапануецца падыход, пры якім адбор базавай лексікі ажыццяўляецца не выключна на аснове слоўнікавых фіксацый, але і з улікам сучаснага маўленчага ўжытку. У якасці дадатковых крытэрыяў могуць выкарыстоўвацца аналіз інтэрнэт-дыскурсу, частотнасць ужывання лексем у сучасных тэкстах, а таксама іх прадстаўленасць у электронных перакладчыцкіх сістэмах і інструментах штучнага інтэлекту.

Выкарыстанне такіх інструментаў у працэсе вывучэння мовы з'яўляецца характэрнай рысай сучаснай адукацыйнай практыкі і не можа ігнаравацца пры распрацоўцы навучальных матэрыялаў. Для беларускай мовы, якая адносна добра прадстаўлена ў лічбавых корпусах і сістэмах аўтаматычнага перакладу, гэта адкрывае дадатковыя магчымасці, але адначасова патрабуе асцярожнага метадычнага асэнсавання.

У адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі ў глотадыдактыцы, арыентаванымі на камунікатыўнасць і арыентацыю на навучэнца, асаблівую ролю набывае ўключэнне ў навучальны матэрыял элементаў жывога маўлення ўжо на пачатковых этапах навучання. Дыскурсіўныя і камунікатыўныя адзінкі, якія шырока выкарыстоўваюцца ў паўсядзённай камунікацыі, не могуць разглядацца як другасны або дадатковы кампанент навучання. Уключэнне дыскурсіўных і камунікатыўных слоў у лексічны мінімум нават на базавых узроўнях дазваляе навучэнцам з самага пачатку знаёміцца з жывым маўленнем і фарміраваць уяўленне пра рэальныя камунікатыўныя мадэлі. Такі падыход спрыяе пераходу ад механічнага засваення граматычных канструкцый да разумення мовы як інструмента жывой камунікацыі і адпавядае сучасным прынцыпам навучання замежным мовам.

7. Агульныя патрабаванні да паўзроўневага падручніка. З улікам апісаных вышэй умоў і выклікаў, паўзроўневы падручнік па беларускай мове як замежнай павінен адпавядаць шэрагу агульных патрабаванняў. Па-першае, ён павінен быць сучасным не толькі з пункту гледжання моўнага матэрыялу, але і з пункту гледжання камунікатыўных сітуацый і дыскурсаў, на якіх грунтуецца навучанне. Асноўны матэрыял падручніка павінен абапірацца на актуальныя формы камунікацыі, уключаючы інтэрнэт-дыскурс. Па-другое, падручнік не павінен зводзіцца да ролі этнаграфічнага або краязнаўчага дапаможніка. Звесткі пра Беларусь і беларускі культурны кантэкст з'яўляюцца неабходнымі, аднак яны павінны ўводзіцца функцыянальна і быць уключанымі ў моўныя заданні, а не існаваць як самастойны, ізаляваны кампанент. Па-трэцяе, важным патрабаваннем з'яўляецца пазітыўны і матывацыйны характар навучальнага матэрыялу. Падручнік павінен быць скіраваны на заахвочванне навучэнцаў да далейшага вывучэння мовы і працы з ёй, а не на фіксацыю цяжкасцей або дэфіцытаў моўнай сітуацыі.

Нарэшце, падручнік павінен разглядацца як частка больш шырокага праекта, які ўключае платформу метадычнага суправаджэння. Такая платформа забяспечвае доступ да аўдыяматэрыялаў, метадычных рэкамендацый і магчымасць абмену досведам паміж выкладчыкамі. Асаблівую ролю яна адыгрывае ў падтрымцы настаўнікаў-аматараў, якія працуюць з беларускай мовай як замежнай па-за межамі акадэмічных устаноў.

Такім чынам, стварэнне паўзроўневага падручніка па беларускай мове як замежнай з'яўляецца актуальнай задачай сучаснай беларускай глотадыдактыкі. Назапашаны метадычны досвед, наяўнасць апісанняў узроўняў валодання мовай і лексічных мінімумаў, а таксама практыка выкладання ў розных краінах дазваляюць гаварыць пра гатоўнасць да рэалізацыі такога праекта, нягледзячы на адсутнасць афіцыйнай нарматыўнай базы.

Спецыфічныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы — абмежаванае камунікатыўнае асяроддзе, дыяспаральны характар моўнай супольнасці, высокая варыянтнасць лексікі і змена ролі лічбавых тэхналогій — патрабуюць адмысловых метадычных рашэнняў. Яны закранаюць як структуру падручніка, так і прынцыпы адбору і прэзентацыі лексічнага матэрыялу. Разам з тым эфектыўнае функцыянаванне паўзроўневага падручніка немагчыма без адпаведнай інфраструктуры метадычнага суправаджэння. Платформа, якая аб'ядноўвае выкладчыкаў, навучэнцаў і зацікаўленую супольнасць, стварае ўмовы для апрабацыі, абмену досведам і пастаяннага ўдасканалення матэрыялаў. У такім фармаце падручнік перастае быць статычным прадуктам і набывае

характар “жывога” праекта, здольнага адаптавацца да патрэбаў навучэнцаў і выклікаў часу.

References

Барысенка Вольга. 2017. *Вучэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай мове як замежнай. Дыяхранічны аспект.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 1: 16–23 [Barysenka Volha. 2017. *Vučèbna-metadyčnyja dapamožniki pa belaruskaj move jak zamežnaj: dyjaxraničny aspekt.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 1: 16–23].

Важнік Сяргей. 2006. *Беларуская мова ў Інтэрнэце.* “Acta Neophilologica” 8: 79–89 [Važnik Sjarhej. 2006. *Belaruskaja mova ŭ Intèrnèce.* “Acta Neophilologica” 8: 79–89].

Калета Радаслаў. 2019. *Беларусістычная глотадыдактыка як паўнавартасная галіна навукі.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 3: 7–18 [Kaleta Radaslaŭ. 2019. *Belarusistyčnaja hlotadydaktyka jak paŭnavartasnaja halina navuki.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 3: 7–18].

Каліта Іна, Садоўская Анжаліка, Старавойтава Надзея. 2021. *Фразеалагічны мінімум беларускай мовы: задачы і перспектывы.* Ústí nad Labem [Kalita Ina, Sadoŭskaja Anžalika, Staravojtava Nadzeja. 2021. *Frazealahičny minimum belaruskaj movy: zadačy i perspektyvy.* Ústí nad Labem].

Сямешка Лідзія. 2018. *Міжнародная летняя школа беларусістыкі: мэты і матывы вывучэння беларускай мовы.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 2: 13–18 [Sjameška Lidzija. 2018. *Mižnarodnaja letnjaja škola belarusistyki: mèty i matyvy vyvučènnja belaruskaj movy.* “Belaruskaja Mova jak Zameznaja” 2: 13–18].

Сямешка Лідзія, Барысенка Вольга, Кныш Ларыса, Рамза Таццяна, Якуба Святлана. 2017. *Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай: базавы ўзровень (A2).* Мінск [Sjameška Lidzija, Barysenka Vol'ha, Knyš Larysa, Ramza Taccjana, Jakuba Svjatlana. 2017. *Leksičny minimum pa belaruskaj move jak zamežnaj: bazavy ŭzroven' (A2).* Minsk].

Сямешка Лідзія, Барысенка Вольга, Рамза Таццяна, Якуба Святлана. 2016. *Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай: элементарны ўзровень (A1). Агульнае валоданне.* Мінск [Sjameška Lidzija, Barysenka Vol'ha, Ramza Taccjana, Jakuba Svjatlana. 2016. *Leksičny minimum pa belaruskaj move jak zamežnaj: èlementarny ŭzroven' (A1). Ahul'nae valodanne.* Minsk].

Сямешка Лідзія, Лебядзінскі Сяргей, Ганчар Рыгор, Кажухоўская Людміла, Сандалава Таццяна. 2025. *Беларуская і руская мовы як замежныя. Узроўні валодання.* Пад рэд. Л. Сямешкі і С. Лебядзінскага. Мінск [Sjameška Lidzija, Lebjadzinski Sjarhej, Hančar Ryhor, Kažuxoŭskaja Ljudmila, Sandalava Taccjana. 2025. *Belaruskaja i ruskaja movy jak zamežnyja. Uzroŭni valodannja.* Pad rèd. L. Sjameški i S. Lebjadzinskaha. Minsk].

Waszczyńska Katarzyna. 2018. *Who Speaks Belarusian? The Language Situation in the Republic of Belarus.* “Ethnologia Polona” 38: 171–185.